


## ПАМІЖ НАМІ, СУСЕДЗЯМІ

Што ні хата, то свой комін і свае парадкі. У Сцяпанавай — быў матрыярхат: гэта значыць, як жонка скажа, так і будзе. Муж нават рады. А што? Атрымаў загад — выканаў і галава не баліць. Але ж...

Не, не заўсяды як на Дзяды: здараецца на вяку і па спіне, і па баку. Сцёпа ўліп аднойчы — дзейнічаў на свой одум.

...Дуся яго ў тую нядзелю на базар паехала, яму загадала праз дзве гадзіны квактуху з гнязда ссадзіць і пакарміць.

— Пад ёй, — нагадала яна — чатырнаццаць курянят. Не дай бог не далічуся, як летась індыкоў, — галаву знясу.

Жонка сказала гэта спакойна, але муж пачырванеў. Быў за ім такі грэх: забыўся неяк варотцы зачыніць... Двух індыкоў ліса, напэўна, панесла.

Таму на гэты раз Сцёпа ўжо не вароніў — уважліва прасачыў за стрэлкамі гадзінніка, у патрэбны час спаднізу, у дзве рукі падхапіў квактуху — палічыў у гняздзе пушысцікаў і пахаладзеў: іх было... дзесяць!

— Лёня, што рабіць?! — кінуўся да сябра з пытаннем. (Не здагадаўся, бядак, што малыя маглі «завіснуць» у курыцы пад крыламі.)

— Ды не хвалюйся, — суцешыў той. — Я тваю бяду адной левай разваду. Баба Соня — ты ж ведаеш — кожнае лета па паўсотні курянят купляе... «Свіснем» некалькі штук, — яна і не заўважыць.

...Што праўда, тое праўда: гэта гаспадыня курянят лічыла толькі ўвосень. А вось Сцёпава Дуся — адразу ж, як з базару прыехала.

— Тут жа 20?! Адкуль? — здзівілася яна.

Сцёпа трымаўся стойка:

— Ведаць не ведаю! Я іх наогул не лічыў... Квактуху пакарміў, як ты сказала, і ўсё.

...Да бабы Соні, ён праўда, потым схадзіў — павініўся, два мяшкі зерня завёз.

Яго многа ў свірне было, так што Дуся гэтай страты таксама не заўважыла.

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*

## ПІВА ЗБЛІЖАЕ ЛЮДЗЕЙ, АЛЕ НЕ ЎСІХ

Недзе ў сярэдзіне 90-х гадоў здарылася ў мяне сустрэча, памяць пра якую жыве да сёння.

Трэба па парадку? Тады...

Настрой у той надвячорак у мяне быў харошы... Яшчэ лепшым зрабіць хацелася: гэта значыць, шліфануць свае 170 грамаў на брата добрым піўком!

Тут трэба зазначыць, што любая піўнушка ў той час (ды і нашмат раней) была мо адзіным месцам, дзе людзі пачуваліся роўнымі, дзе маглі з першымі сустрэчнымі шчыра пагаварыць пра палітыку, пра мастацтва, абмеркаваць жыццёвыя праблемы... Нехта ж нездарма пісаў, што «Ссорит нас водка, братцы, / Пиво сближает людей...»

І сапраўды, неяк раз, за куфлем пеннага, я міжволі «падслухаў» размову двух маладых мужчын:

*«Кожны дзень мы п'ём літроўку*
*За здароўе Пеці Броўкі»,* — пачаў быў адзін.

*«За здароўе Броўкі Пеці*
*Мы прап'ём усё на свеце»,* — падхапіў другі.

А далей пачалася спрэчка пра аўтарства. Першы лічыў, што гэты вершык напісаў Караткевіч, каб такім вось арыгінальным чынам апраўдаць свой грэх злоўжывання, другі сцвярджаў, што сам Гілевіч, бо надта ж складна атрымалася: пачуў і злёту запомніў!

Як аказалася — нават я.

...У той надвячорак людзей у піўной было мала: трое шумных распараных мужчын ды ў куце яшчэ два дзядзькі.

Выглядалі яны як звычайныя настаўнікі, піва закусвалі нейкай сушанай драбязой, але ж я прыглядзеўся і пазнаў... Рыгора Барадуліна і Генадзя Бураўкіна, якіх у тыя гады досыць часта паказвалі па тэлевізары. «Вядомыя паэты, — падумаў пра іх. — Не грэбуюць, бач, пралетарскай піўнушкай».

Мэтры, як выглядала, гаварылі пра нейкую публікацыю ў часопісе «Нёман».

Я дрэнна чуў іх вучоную дыскусію і амаль нічога не зразумеў, але ж расхрабрыўся і ўголас паўтарыў некалі пачутае:

*«Кожны дзень мы п'ём літроўку*
*За здароўе Пеці Броўкі...»*

Бураўкін, бачу, насцярожыўся: хто гэта «мы»? А Барадулін так прыязна ўсміхнуўся, што я асмялеў яшчэ болей — падумаў, а чаму б шаноўным паэтам не праставіць піва?!

З гэтай думкай я рушыў да стойкі буфета, замовіў, забраў, а стаў несці ў кут да століка і жахнуўся: «А што ж далей? Аб чым загаварыць, калі мая дасведчанасць у паэзіі «ў рамках» школьнай праграмы (Колас, Купала, Багдановіч... Ну Крапіва яшчэ)... Да таго ж у памяці ўсплыло сцвярджэнне знакамітага Казьмы Пруткова пра тое, што пахвала гэтак жа патрэбна таленту, як каніфоль — смычку віртуоза.

А што пахваліць у Бураўкіна, у Барадуліна? Іх жа ў школе не праходзілі.

Таму я, пачціва праставіўшы піва, падзякаваў гэтым шаноўным людзям за вершы, сказаў, што вельмі спяшаюся і проста... уцёк. Спачатку думаў — ад ганьбы, потым — ад шчырай, вясёлай размовы.

**А. Хаванскі,**
*г. Мінск.*

## СЛЕД НА ЗЯМЛІ

...Заліўныя лугі ў пойме Прыпяці вясковы багацей пан Кяневіч атрымаў у спадчыну мо ў часы прыгоннага права, але карыстаўся імі не толькі сам. Простыя сяляне (потым калгаснікі) таксама касілі сена. Далекавата было (ад вёскі да сенажацяў кіламетраў з дзесяць), а таму вяскоўцы — пераважна мужчыны і моладзь — з пачатку сенакосаў працавалі там з начлегамі. Курані (гэта буданы такія) ставілі ў адным і тым жа месцы — ля Гудкова каверта.

Гэтым словам у нас называлі азярыны, што заставаліся пасля паводак. Іх было многа — розных памераў і глыбінь. Настаўнік геаграфіі нават казаў, што некалі тут было мора, якое апісаў яшчэ Герадот... Аднак гэты бацька гісторыі нас, падлеткаў, цікавіў меней. Загадкай было, прычым да каверта — нейкі гудок?

Каб даведацца, пайшлі да самага старэйшага з тутэйшых дзядоў, і ён расказаў, што некалі да маёнтка пана Кяневіча вяла чыгуначная вузкакалейка, што па ёй кожную божую раніцу, з гудком, прыходзіў паравоз. (У пана былі бровар, цагельня, бондарская майстэрня і шмат лесу. Усё гэта набывалі і вывозілі купцы з іншых гарадоў.)

А ў вёсцы жыў селянін, Яўсейка. Росту быў невялічкага — метр з шапкай, дробненькі, сухарэбры, а ўжо злы... Поедам еў сваіх дамачадцаў! Прачнецца раніцай і гарлапаніць — на сыноў, на дачку, на зяця, на жонку (яны ўсе разам жылі): вам бы, маўляў, толькі спаць! Гультаі! Лайдакі! У вас жа морды ад сну папухлі! Чакаеце, пакуль я ўсё зраблю?!

І так штодня — і зімой, і ўлетку, прычым — на ўсю вёску!.. Таму людзі, слухаючы гэта, і сталі гаварыць, што адзін гудок у маёнтку, а другі ў вёсцы.

Прыляпілася да Яўсея гэта мянушка — аж да таго, што нават валасны пісар у нейкай паперы напісаў: Яўсей Гудок — не ўспомніў сапраўднага прозвішча.

...Дык вось. У адну з касавіц гэты гарлапан разам з сынамі і зяцем стаў нарыхтоўваць сена: касіць, сушыць, складваць у копы. Дзён колькі папрацавалі — харчы пад'елі, трэ было новых падвезці. Для гэтага, вечарком, маладзейшыя мужчыны махнулі дамоў — раніцой планавалі вярнуцца.

Яўсей, галодны, чакаў. А ўжо накрычаўся — аж голас сарваў:

— Я вам пакажу! Я вас накармлю, — хрыпеў на сваіх. — Вы ж, лайдачае племя, у мяне папрацуеце!

За віл — і давай копы разбураць: сухое сена ў азярыну, у ваду насіць.

— Яўсей! Ты з што — зусім з глузду з'ехаў? — пытаюць суседзі.

А ён сена «топіць» ды гне сваё:

— Няхай ведаюць, як пазніцца, як да бацькі ставіцца!..

Многа шкоды зрабіў.

А тут і дзеці з'явіліся: два сыны яго, зяць і сват Ціт.

— Колькі вас можна чакаць?! — замест прывітанняў захрыпеў Яўсей. — Бач, прыехалі — у свіныя галасы!

— До крычаць, гіцаль, — азваўся Ціт. — Учора твая дачка двух сынкоў нарадзіла. Доктара да яе прывозілі, а сёння пакуль адвезлі ў мястэчка...

Сват пра гэта расказаў, а зяць з сынамі ў гэты час хіба азіраліся ды вачыма лыпалі.

— Дзе ж сухое сена падзелася? — пыталіся ў бацькі.

Той — прыціхлы — на азярыну паказаў... А потым схапіў вяроўку і давай лупцаваць сам сябе — па спіне, па нагах:

— Вось табе, дурню! Вось...

Ціт — мужчына магутны — трохі падумаў, паназіраў за ім.

— Ды не так ты б'еш, — кажа свату. — Дай пакажу, як трэба.

Падышоў да Яўсея, забраў вяроўчыну, галаву яго зашчаміў у сябе пад пахай і па задніцы — за ўсе яго шаленствы, за ўсю дурнату і знявагі...

Разышоўся б, адвёў душу, але зяць з сынамі спынілі — папрасілі адпусціць старога.

...Яго, Яўсея Гудка, на гэтым свеце даўно ўжо нямашака. А вось месца, дзе ён сена мачыў, засталося. І не Яўсеевым яго ў акрузе завуць, а Гудковым.

Розную памяць пакідаюць людзі.

**Н. Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж.***

Слушную думку не грэх паўтарыць: *«...Мне здаецца, што па смеху можна пазнаць чалавека. Калі вам з першай хвіліны прыемны смех каго-небудзь з зусім незнаёмых людзей, то смела кажыце, што гэта чалавек харошы».*

Нельга не верыць: Дастаеўскі пісаў.

І вы пішыце: конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца.

Неасабісты суб'ектыў



# «Аб бессэнсоўнасці войнаў у ракурсе вечнасці»

### Караткевіч, якога вы, магчыма, не чыталі

Іду да кніжнай шафы, шукаю часопіс. Ён дакладна дзесьці тут, бо нядаўна гартала. Ён не згубіўся ва ўсіх маіх пераездах, пакоях-кватэрах-інтэрнатах. Калісьці я яго беспардонна прысабечыла ў адной бібліятэцы (і сумленне мяне з гэтай нагоды абсалютна не тузае, бо бібліятэку тую, ведаю, даўно расфарміравалі, кнігі перадалі ў іншыя, а ўсю перыёдыку здалі ў макулатуру)... Вось ён, ляжыць на паліцы, крыху пакамечаны, з пажаўцелымі ўжо старонкамі. «Маладосць», адзінаццаты нумар за 1990 год. Чым ён мне так цікавы, спытаеце. У ім шмат матэрыялаў, прысвечаных Уладзіміру Караткевічу, — якраз да 60-годдзя пісьменніка. Многія друкаваліся ў той час упершыню: асабістыя пісьмы, дзённік... Вось гэты самы дзённік, апошні, датаваны ліпенем 1984 года, з каментарыямі сябра пісьменніка Валянціна Ждановіча, і хачу сёння перачытаць. Таму што сёння 25 ліпеня — роўна сорак гадоў, як Караткевіча не стала...

Я чытаю яго не першы раз. Ведаю нават некаторыя фразы на памяць. Але кожны раз не перастаю здзіўляцца. Дзённік пісаўся вельмі хворым чалавекам, якому з кожным днём станавілася ўсё горш. Умовы, у якіх ён знаходзіўся, былі абсалютна спартанскія. У тым апошнім ліпені Караткевіч з сябрамі Валянцінам Ждановічам і Пятром Драчовым выправіліся ў падарожжа па Прыпяці на надзіманым плыце, мяркуючы паўтарыць маршрут 1969 года, вынікам якога стала напісанне Караткевічам шыкоўнага нарыса пра Палессе «Званы ў прадонннях азёр». (Як расказвала мне калісьці перакладчыца твораў пісьменніка на рускую мову Валянціна Шчадрына, за гэты нарыс яго чыхвосцілі аж у Маскве, на пленуме Саюза пісьменнікаў СССР — за «нацыяналістычныя матывы».) Дык вось, гэта падарожжа праз пятнаццаць гадоў задумвалася сябрамі Караткевіча як спроба вярнуць яго да жыцця: пісьменнік цяжка перажываў страту жонкі і сам зусім занепаў у хваробу. І Уладзімір Сямёнавіч пагадзіўся, нягледзячы на тое, што адчуваў сябе не вельмі, — як сам іранічна напіша ў тым дзённіку: *«І адмірал Караткевіч, толку ад якога было, шчыра кажучы, пэўна, столькі, колькі ад адмірала Ражэственскага пад Цусімай»...*

І вось гэты хворы чалавек, які амаль нічога не есць (толькі п'е вялізную колькасць чаю, як згадвае Ждановіч), які дрэнна спіць, піша ў асабістым дзённіку — не ў творы, разлічаным на чытача, а проста ў асабістых нататках — словы, народжаныя вострым розумам, убачаныя пільным вокам. Якія большасць з нас — бадзёрых і здаровых — ніколі б не прыдумалі і не напісалі. Вось, напрыклад, пра што думае-разважае на пачатку падарожжа: *«Аб сэнсе жыцця. Аб бессэнсоўнасці войнаў у ракурсе вечнасці. Аб параўнальных магчымасцях дабра і зла. Аб іх процірборстве — у грамадстве і ў жыцці чалавека. Аб любові і каханні. Аб гераізме. Аб подзвігу. Аб смерці. Аб бессмяротнасці. Пытанні, якія юнацтва ўсіх стагоддзяў задае сабе і наваколльным. І чым больш і настойлівей задае іх, тым далей не робіцца старасцю...»* А далей — параўнанні-апісанні, уласцівыя толькі яму, і такая прыгажосць мовы, і такія яскравыя вобразы, нібы сам плывеш па той Прыпяці і глядзіш на берагі: *«Вербы на пясчаным узгорку. На гэтыя вербы села такая чарада маладых шпакоў, якой мне дагэтуль не даводзілася бачыць. Спачатку яны доўга і ўпарта ганялі над берагам, дзе мы спыніліся, (луг, балоты, зарасці вярбоўніку), вялізнага коршака. Міла было глядзець, як упарта і ў канцы з якім трыумфам...» «Сонца ўзыходзіла, пераркрэсленае хмаркамі...» «Пеpакаты і перакаты. Ля слупа 27 км у трыснягу палескі стажок на беразе, мне здалёк здалася хата. І купа трыснягу на беразе, а далей, на правым беразе, дзіўны горб урвішча....» «Узгорак. На ім вербы, спавітыя ажыннікам, хмызы, парэчкі. За намі азерца, дзе кумкаюць жабы і хмызы густыя, што аж гудуць ад камарынага звону...» «Затока вельмі рыбная, б'е рыба — аж срэбныя целы плотак лятуць у паветры. Затока з лілеямі, якія закрываюцца на ноч, вялікія-вялікія, як на кепскіх рэкламах...» «На вяршыні дрэва — гіганцкае гняздо дзікіх — яны больш асцярожныя за хатніх — буслоў. Проста велічнае дрэва, а гняздо не пляскатае, а як папаха...» «Перад Валянскім мастом Прыпяць бы ў цясніне з высокіх берагоў, а на іх дубы! Дуб упаў у ваду верхавінай. Даўно ўжо мёртвы, сухія сукі казачна выгнуліся над вадой. Даўно ўжо мёртвы, а на зямлі, што засталася між каранёў (ці можа, яе нанесла), цвітуць жоўтыя і ліловыя краскі. Прыклад табе, чалавеча...»*

Праз некалькі дзён пасля гэтага запісу, 18 ліпеня, падарожнікі вымушаны былі спыніць сваю вандроўку, каб адправіць Караткевіча, якому стала зусім блага, у Мінск. Было гэта сорак гадоў таму, і з транспартам было не так проста як цяпер. Тым больш заплылі яны ў глухі кутok Палесся, якія і сёння там сустракаюцца. Так што да сталіцы дабраліся больш чым праз суткі. Караткевіч узяў абяцанне са сваіх сяброў, што яны працягнуць падарожжа. І сам паабяцаў да іх далучыцца, калі яму палепшае. Але 25 ліпеня яго не стала. Як успамінае Валянцін Ждановіч, у гэты дзень яны з Пятром Драчовым, працягваючы плыць па Прыпяці, зайшлі ва ўрочышча Галасавыя — пра гэта дзівоснае месца Караткевіч пісаў у нарысе «Сцюдзёная вясна, або 1000 год і 7 дзён». *«А пасля было дзіва. Неапісальнае. Мабыць, з апошніх такіх на нашай зямлі... Стаялі над гэтай высокай вадой дубы каркасломныя, дубы-вежы, дубы, на якіх замкі можна было б будаваць, дубы-хмары ў палову неба, дубы-калоны, на якіх трымаецца неба над гэтай зямлёй...»*

Для чаго, уласна, я так старанна сёння перапісваю гэтыя цытаты? Іх аўтар варты таго, каб аб ім памяталі, каб яго чыталі. Ён сам заўсёды казаў і пісаў, што хоча, каб чытачы з яго дапамогай адкрывалі і пазнавалі для сябе штосьці новае...

Вось і я падумала: а раптам у кагосьці няма адзінаццатага нумара «Маладосці» за 1990 год...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**